ЛЮДМІЛА СЕГЕНЬ
Беласток

# КАЛЯНДАРНЫЯ АБРАДЫ БЕЛАРУСАЎ: СВЯТА ЮРЫЯ Ў ВЁСЦЫ КАРАВАЕВА ПУХАВІЦКАГА РАЁНА НА МІНШЧЫНЕ І Ў ВЁСЦЫ ТРЫВЕЖА НА БЕЛАСТОЧЧЫНЕ

Абрады ў традыцыі народа выконваюць важную і істотную ролю. На беларускіх землях амаль тысячу гадоў суіснавалі дзве культуры: язычніцкая, што ішла ад каранёў мінуўшчыны і хрысціянская, больш позняя па часе ўзнікнення.

Аб'ектам даследавання выступае каляндарны абрад – свята Юрыя – на тэрыторыях Міншчыны і Беласточчыны. Спецыфіка і непаўторнасць абрадаў на Міншчыне (вёска Караваева Пухавіцкага раёна) і на Беласточчыне (вёска Трывежа Гайнаўскага павета) дае падставу гаварыць аб суіснаванні і ўзаемадапаўненні культур. Паспрабуем рэканструяваць цэласнасць моманту аднаго з вялікай колькасці земляробчых свят – веснавога абраду Юрыя на ўказаных тэрыторыях.

Дакладнае апісанне сялянскага свята, вытрымкі з дыялектнай мовы, акрамя таго, земляробчыя назвы, тэрміны, якія перадаюць адметныя рысы культурнага этнасу несумненна дапамагаюць ўспрыняць абрад як мага праўдзівей, выявіць яго рэгіянальнасць і самабытнасць.

У культуры Беласточчыны як і Міншчыны, дзе асноўным заняткам жыхароў было земляробства, рытм жыцця чалавека падзяляўся на два этапы: першы этап быў звязаны са штодзённым абавязкам, цесна звязаны з прыродай, якая дазваляла фізічна існаваць чалавеку, і другі, не менш важны этап быў звязаны са святам. Сёння свята – гэта час адпачынку, гульняў, але даўнейшае свята – гэта штосьці асаблівае. Гэта час роздуму, працы. А жыццё ў згодзе з натуральным асяроддзем, ад чаго залежаў дабрабыт селяніна, дапаўняла кожнае свята абрадамі, магічнымі дзеямі, замовамі, варажбой. Першае вялікае веснавое свята Юрыя,



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

калі беларусы ўшаноўвалі росквіт прыроды, надыход вясны, першы выган жывёл на палі, прыцягвае нашу ўвагу. З надзеяй на ўраджай, дабрабыт, селянін пачынаў працоўную вясновую дзейнасць.

Заўсёды ў адзін час, як Каляды ці Купалле, святкавалася веснавое свята Юрыя. Царква прымеркавала да яго ўрачыстасць у гонар аднаго са сваіх апосталаў – Георгія. У абраднасці, што суправаджае Юрыя, амаль нічога не прысутнічае ад хрысціянства. У ёй выразна праглядае язычніцкая, земляробча-жывёлагадоўчая па змесце міфатворчасць[1]. Ад велікапакутніка Георгія Перамоганосца (як сведчыць гісторыя, рымскі афіцэр Юрый быў пакараны смерцю за распаўсюджанне хрысціянства. Яго сталі зваць Перамоганосцам за перамогу над пакутамі. У гонар цярпення і мужнасці Юрый атрымаў боскую ласку – быць апекуном хрысталюбівых воінаў) да заступніка жывёлы, асабліва коней, ахоўніка палёў, раслінаў[2]. Адзначалася Юрыя 23 красавіка па старому стылю, ці 6 мая па новаму, і дзякуючы таму, што да гэтага дня быў прымеркаваны першы выган жывёлы на пашу, свята набыло вялікую ўрачыстасць і атрымала шырокае распаўсюджанне. Як на Беласточчыне, так і ў Беларусі, Юрыя лічыцца адным з самых папулярных у народзе гадавых свят.

На Юрыя выконваліся два асноўныя комплексы ахоўна-магічных па сваіх мэтах абрадаў[3]. Адзін быў звязаны з першым выганам жывёлы на поле і лічыўся святам пастухоў. Абрады, што суправаджалі свята, былі скіраваны на захаванне жывёл ад дзікіх звяроў, хвароб. Другі комплекс насіў чыста аграрны характар і быў святам аратаяў, і здзяйсняўся дзеля добрага росту збажыны і аховы засеяных палёў ад стыхійнай небяспекі.

Веснавая сяўба, як вельмі адказная работа ў працоўным годзе земляроба, была звязана з многімі звычаямі і абрадамі. Працу вясной пачыналі да Юрыя, крыху раней ці пазней у залежнасці ад прыходу цёплых дзён і прасыхання зямлі, аб чым вырашалі самі земляробы. Для заворвання найчасцей выбіралі суботу, таму што лічылі, як адзначаў М. Федароўскі, што гэта дзень Божай Маці[4], ахоўніцы зямлі і благадзецельніцы. Гэтыя вынікі былі зроблены на падставе ўважлівых назіранняў за пачаткам цыкла земляробчых прац сялян з вёскі Тры-

---

[1] В. Бандарчык, К. Кабашнікаў, А. Фядосік, *Каляндарныя абрады і звычаі*, Мінск 2003, с. 53.

[2] Тамсама, с. 187.

[3] А. Ермолов, *Народная сельскохозяйственная мудрость в пословицах и поговорках и всенародный месяцеслов*, Санкт-Петербург 1901, с. 12–13.

[4] M. Federowski, *Lud białoruski na Rusi Litewskiej*, Kraków 1897, t. 1, s. 134.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

вежа на Беласточчыне. На Міншчыне лічылі чацвер днём, які ў ніякім выпадку не падыходзіць для пачатку вясновых палявых работ[5].

Ніколі не пачыналі араць ў дні посту (Беласточчына і Міншчына), таму што марна было б чакаць добрага ўраджаю[6]. Зямлю рыхтавалі загаддзя: навоз, які ўсю зіму складалі ў ямы, вывозілі на палі. Гэта рабілі тады, калі крыху сыдзе снег, або пераворвалі навоз з зямлёй за некалькі дзён да сяўбы. Рабілі гэта не ў час новага месяца – *коп з"і͡ел'е не росл'о* (Беласточчына). Перад выездам у поле асвячалі валоў ці каня, саху ці плуг.

Палеткі таксама былі падпарадкаваны складанай сістэме. На адным полі сеялі жыта, другое – "гуляла", а толькі летам яго аралі, каб не зарастала, а на восень на ім сеялі жыта. На трэцім садзілі бульбу, буракі, увосень іх выбіралі і на зіму засявалі жытам. А дзе было жыта – на вясну зноў садзілі бульбу, ці сеялі ярыну. Так кожны гаспадар, калі меў удосталь зямлі, мог карыстацца трыма палеткамі. Гаспадары з вёскі Трывежа на Беласточчыне называлі гэтую сістэму – *паран"іна*, і строга трымаліся гэтага адвечнага парадку. На Міншчыне, праўда, гэта сістэма не ўжывалася сялянамі, самае большае, што меў селялін перад другой Сусветнай вайной – невялічкі агарод з хатай і сельскагаспадарчымі забудовамі. Сяляне абмяжоўваліся бульбай, морквай, збожжам і толькі зрэдку іншай гароднінай.

Акрамя буракоў і бульбы, садзілі яшчэ капусту, агуркі, моркву, цыбулю. Для гэтага выдзялялі кавалак поля каля хаты, там, дзе было болей сонца. Калі зямля была падрыхтавана, добра угноена, перакопана і хапала вільгаці, насенне кідалі адразу ў глебу, а на ноч накрывалі якой-небудзь дзяругай, каб расліны не змерзлі. Агуркі патрабавалі большага догляду, іх трэба было калі-некалі падліваць і хаваць ад тумаиоў. Збіралі агуркі ўсё лета, амаль да восені. Капуста, таксама як і моркква, вытрымлівалі нават невялікія замаразкі. Узімку іх клалі ў халоднае месца. Цыбуля павінна была быць выкапана, добра прасушана і сплецена ў "косы", ці вянкі. У такім стане, падвешаная да столі над печчу, яна захоўвалася ўвесь год. Вельмі вялікую ўвагу сяляне надавалі тэрміну пасадак: месяц павінен быць малады, а не поўны – капуста магла вырасці *колов'ата*, гарох і фасоля – пасохнуць, а бульбу саджалі ў стары месяц – *коб робак'у͡оў не был'о*. Перавагу ў пасадках аддавалі (на Беласточчыне) мужчынскім дням тыдня – панядзелак, аўторак, ча-

---

[5] В. Ліцьвінка, *Святы і абрады беларусаў*, Мінск 1998, с. 83–84.

[6] S. Dworakowski, *Kultura społeczna ludy wiejskiego na Mazowszu nad Narwią*, Białystok 1964, s. 129.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

цвер. У захаванні гародніны гаспадары з беларуска-польскага памежжа і Міншчыны прытрымліваліся аднолькавых традыцый.

Больш цікавым з’яўляецца абрад першых засевак на Беласточчыне, які поўнасцю перадае дзеянні сейбіта. Першыя засеўкі рабілі ўрачыста: мыліся, апраналі чыстае адзенне, трымалі ў чысціні хату. Сейбіт, ў асноўным мужчына (зрэдку маглі сеяць і жанчыны, але гэтага часцей не было, бо заўсёды на дапамогу прыходзіў бацька ці дзядуля), браў сявеньку, насыпаў зерне, акрамя гэтага, да зерня, прызначанага да сяўбы, дамешвалі насенне, якое было асвешчана ў царкве. Усё гэта спрыяла добраму пачатку сяўбы і буйному ўраджаю. *С’ів'ен’ка* (яшчэ раней казалі *кор'опка*) *был'а зр'обл’ена з бл’ах’і, пуўкр'угла, м”і͡ела в'ыйамку на жыв'у͡от, коп прыл’аг'ала до груд”і, з дырк'ам’і на п'асок, коп пов”і͡ес’іт’і, в”і͡ешалас’а ч'ерез одн'е пл’еч'о*, часцей на левае, а правай рукой сеялі – так было зручней. Пры хадзьбе кідалі зерне на ўзараную глебу, калі ступала правая нага (пад правую нагу). Добра было, калі знаходзіліся ўмельцы і сеялі з абедзвюх рук, такія людзі часцей запрашаліся да сяўбы на дапамогу. Калі зерня ў сявеньцы ўжо не было, тады падносілі з мяхоў, якія стаялі на полі. Засявалі нейкі пэўны кавалак, стараліся гэта зрабіць да заходу сонца, а потым вярнуцца да дадому і яшчэ ў кругу сваёй сям’і ці памагатых адзначыць гэтае свята. Калі пачатак сяўбы быў добрым і яму не перашкаджала надвор’е – можна было спадзявацца поўных каласоў.

Важнае значэнне для сяўбы меў стан месяца. Пачыналі сяўбу на поўню, каб жыта было поўным. Лічылі, каб кожная справа распачыналася на маладзік (малады месяц), тады усё будзе расці за фазамі месяца (Беласточчына і Міншчына)[7]. Калі пасля засеву ўсёй зямлі ў гаспадара заставалася яшчэ колькі збожжа – гэта было добрым знакам – будзе поўны свіран. Калі, не дай Божа, застанецца не засеяны кавалак зямлі, то будзе няшчасце ў хаце (Беласточчына)[8].

Сяляне стараліся захаваць пэўныя рытуальныя чыны: каб зерне добра захоўвалася; каб ніхто “дурным вокам” не глянуў; каб мець шчасце на засеўку; каб праходзячы сусед не перабіў севу; каб тое збожжа, якое было пазычана, было ў свіране пад час севу; калі сяўцу не хапіла зерня, якое прынесена было на поле, ніхто з суседзяў не пазычаў яму, перасцерагаліся, што разам з пазыкай “пойдзе” ад гаспадара шчасце. А калі здараліся выпадкі пазыкі збожжа і нельга было адмовіць бяднейшаму, ці родзічу, не давалі зерня да тых пор, пакуль не засеялі ў сябе ха-

[7] Тамсама, с. 127.

[8] Тамсама, с. 131.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki” Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

ця б палову зямлі. Жанчыны хутчэй за ўсё на полі не былі ў той час. Мужчыны выконвалі ўсе звязаныя з пасевам збожжа аперацыі. Але не сеялі, калі ў хаце гаспадыня пякла хлеб, верылі, што сухая скарынка з хлеба можа “засушыць” ўраджай (Беласточчына і Міншчына)[9].

Гаспадары таксама ведалі, што зерне на продаж нельга аддаваць, пакуль не засеюць у сябе выдзеленай для гэтага плошчы. Сітуацыя магла быць іншай, калі продаж адбываўся, тады купленае зерне ссыпалі ў вывернутыя на левы бок мяшкі, каб “шчасце” не пераходзіла да гаспадара-пакупніка (Беласточчына)[10].

Засеўкі заканчваліся святочнай вячэрай, вясёлай і сытнай, зноў жа з думкай пра тое, што гэта будзе садзейнічаць поспеху сяўбы, урадлівасці будучай нівы. У гэты святочны дзень трэба было спячы каравай, казалі *б’ˈі͡ел ы хл’і͡еп*, і кругом свайго поля абнесці, а поле на той час было ўжо зялёнае ад азімага жыта (Беласточчына). Гаспадары з Міншчыны не толькі абыходзілі поле, але і параўнавалі вышыню сцябла з караваем. Калі апошні хаваецца ў жыце, то ў гэтым годзе жыта будзе добрае. Пасля малітвы яны вяртаюцца дадому, разразаюць хлеб на кавалкі па колькасці членаў сям’і, і ўсе яго ядуць (Міншчына)[11]. Цёплае надвор’е спрыяла росту збажыны: *кол’ˈі уд'ас’ц’е вел’ˈік’е, кол’ˈі мал'ойе* (Беласточчына).

На полі працавалі не толькі гаспадары, але часта і чужыя людзі, суседзі, тыя, што прыходзілі на заробкі. Калі чалавек хварэў і быў самотны, яму таксама дапамагалі аднавяскоўцы (Беласточчына). Беларусы на Міншчыне такую дапамогу, ці гурт людзей называлі “талакой”[12], дзе сябравалі дапамога і добразычлівасць.

Выган жывёлы на Міншчыне ў вёсцы Караваева на пашу адбываўся даволі святочна. Перад тым як выгнаць жывёлу, у варотах клалі яйка, спадзеючыся, што каровы, пераступіўшы яго, будуць круглыя і поўныя, як і само яйка. Падкладвалі таксама пад браму, з якой выпускалася жывёла на вуліцу, замок, каб зберагчы статак ад ваўкоў: замкнуць ім зубы[13].

А сяляне з вёскі Трывежа на Беласточчыне, ўзяўшы ў рукі грамнічную свечку, абыходзілі наўкола жывёлу, збожжа, усе гаспадарчыя

---

[9] Тамсама, с. 130–132.

[10] Тамсама, с. 130–132.

[11] В. Бандарчык, К. Кабашнікаў, А. Фядосік, *Каляндарныя абрады і звычаі*, Мінск 2003, с. 193.

[12] *Беларуская энцыклапедыя*, Мінск 2002, с. 397.

[13] А. Лозка, *Беларускі народны каляндар*, Мінск 2002, с. 107–108.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki” Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

пабудовы, хату. Гэта час, калі пачыналіся частыя маланкі і, баючыся граду, грымотаў, моцнага ветру, гаспадар змушаны быў выконваць старадаўнія дзеянні. Следам за гаспадаром магла ісці гаспадыня і асвячала будынкі свячонай ў царкве вадой. Немалую ролю іграла і галінка вярбы, асвечаная ў Вербную нядзелю, яе выкарыстоўвалі разам з асвячонай вадой. Акрамя таго асвячалі і палі, абыходзілі з вербнай галінкай і вадой. Абкурвалі асвячоным зеллем жывёл, насенне. Вера аб даніне продкам, калі ў гэты дзень гаспадары прыносілі косці і закопвалі іх на полі, або спальвалі і сеялі попел, надавала надзею пазбавіцца ад пустазелля. Попел спрыяў росту раслін, і тыя раслі, апераджаючы, глушачы быллё (Беласточчына і Міншчына)[14].

На гэтае свята ў вёсцы Трывежа спявалі:

Ой, зыдзі, зыдзі, ясны месячык, як млыновае кола,
Ой, выйдзі, выйдзі, сэрца-дзяўчына, прамоў да мяне слова.
– Ой, як я маю, ой, як я маю да цябе выхадзіці:
Людзі гавораць, людзі сачуць – мне цябе не любіці.
– Няхай гавораць, няхай сачуюць хоць па ўсім свеце –
Я цябе любіў, любіці буду, ружовы мой цвеце.
Ой, шуміць жа мне, як вада ў мляне, то й у маёй галованьцы,
Нікуды выйсці, пагаварыці – я ў чужой стараноньцы[15].

Яшчэ:

Ой, у полі тры дубы,
Ой, у полі тры дубы, тры дубы,
Схіліліся да купы.
Там у полі крыніца,
Там у полі крыніца, крыніца,
У ёй студзёна вадзіца.
Там малойчык ваду браў,
Там малойчык ваду браў, ваду браў –
Краску дзеўку спадабаў.
– Дзяўчынанька, чыя ты?
Дзяўчынанька, чыя ты, чыя ты,
Бо прыеду ў сваты.
– Я й у бацькі адзін сын,
Я й у бацькі адзін сын, адзін сын –
Ажанюся абы з кім.

---

[14] П. Шейн, *Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края*, т. 1, ч. 1, Санкт-Петербург 1874, с. 168–169.

[15] М. Гайдук, *Песні Беласточчыны*, Мінск 1997, с. 27.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021

– Я й у маці адная,
Я й у маці адная, адная –
Прыязджай – буду твая![16]

З Юрыем было звязана нямала каляндарнай варажбы паводле прыкмет. Калі на Юрыя ішоў густы, вялікі дождж, то спадзяваліся, што жыта будзе расці густым і стаяць сцяною. Калі на Юрыя раса – коням будзе даволі аўса. У народзе лічылася, што Юрыя вясну пачынае і дае пачатак палявым працам. Практычныя шматгадовыя назіранні селяніна за прыродай складаліся ў пэўныя прыкметы: за колькі дзён да Юрыя зацвітуць сады, пераважна вішні, за столькі дзён да Пятра пойдуць жаць жыта. Сяляне Беласточчыны ў гэты дзень аглядалі азіміну. Лічылі, што ў гэты дзень неабходна наведаць палеткі, інакш яны не дадуць патрэбнага ўраджаю.

Земляроб на Міншчыне асцерагаўся прымаразкаў і казаў: “Калі на Юр’я мароз, дык сей на балоце авёс”, “Як дождж на Юр’я, дык хлеб і ў дурня”, “Юры казаў: “Жыта ўраджу”.

Гаспадарчае свята ў селяніна абавязкова звязвалася з паляпшэннем дабрабыту сялянскай сям’і, элементамі свята былі зварот да рэлігіі, выкарыстанне культавых рэчаў, малітваў і вераванняў. Дабрабыт сям’і гаворыць аб захаванні і працягу свайго роду. Плённая праца і высокія ўраджаі даюць ўпэўненасць у заўтрашнім дні. І асноўнае, без чаго не абыходзіцца праца, свята – гэта ўшанаванне продкаў. Даніна, якой павінен аддзячыць селянін за сваё існаванне, існаванне сваёй сям’і, плён працы (закопванне рэштак ежы ў зямлю, каб пакаштавалі продкі[17]).

Колькасць назапашаных звестак пра традыцыі найбольш яркага земляробчага абраду вясновага цыклу гаворыць аб яго захаванасці і актуальнасці да сённяшняга дня і з’яўляецца своеасаблівым помнікам вуснай народнай творчасці.

Адзінасць сістэм сялянскага і хрысціянскага календара гаворыць аб выразнай і заўважнай розніцы паміж абрадамі, захаванасці язычніцкіх праяваў на Беларусі, што незаўсёды можна растлумачыць, а святы на беларуска-польскім памежжы выдзяляюцца большай рэлігійнай абраднасцю.

Непарушная сувязь чалавека і прыроды, іх адзінага пачатку – ад Бога, яшчэ раз пацвярджае адзіныя глыбокія карані, адчуванні і імкненні беларусаў.

---

[16] Тамсама, с. 12.

[17] І. Крук, *Следам за сонцам*, Мінск, 1998, с. 37.



Zdigitalizowano i udostępniono w ramach projektu pn.
Rozbudowa otwartych zasobów naukowych Repozytorium Uniwersytetu w Białymstoku,
dofinansowanego z programu „Społeczna odpowiedzialność nauki" Ministra Edukacji i Nauki na podstawie umowy SONB/SP/512497/2021